УДК 159.9

*А. М. Калыска, 4 курс*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*намеснік начальніка кафедры*
*сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*

# ФЕНОМЕН «АДХІЛЕНАГА ПОГЛЯДУ» ЯК ФОРМА ПРАФЕСІЙНАЙ РЫЗЫКІ

*Даследаванне прысвечана аналізу феномену «адхіленага погляду» як псіхалагічнага працэсу адхілення ад аб'ектыўнай рэальнасці, характэрнага для супрацоўнікаў аўдыёвізуальных сродкаў масавай інфармацыі.*

У медыятызаваным грамадстве ні адна значная падзея не абыходзіцца без удзелу сродкаў масавай інфармацыі. Такі ўдзел можа быць спалучаны з рызыкамі, абумоўленымі спецыфікай асвятляемых з'яў: ваенных дзеянняў, палітычных канфліктаў, стыхійных бедстваў. Адпаведна, журналісты, якія трактуюць гэтыя падзеі ў медыя, прымаюць апасродкаваны ўдзел у канфліктах, следствам чаго з'яўляецца досыць вялікая колькасць ахвяр сярод супрацоўнікаў СМІ. Каб якасна і поўна паказаць усю карціну таго, што адбываецца, відэаапаратарам і журналістам неабходна знаходзіцца ў авангардзе узброеных сіл, нярэдка не маючы пры гэтым адпаведнай падрыхтоўкі. Да прыкладу, падчас вайны ў Іраку ў перыяд з 2001 па 2012 гг. загінула каля 380 журналістаў, большая частка з якіх – відэаапаратары [1]. Псіхолагі ў гэтай сувязі паказваюць на праблему: аператар, дзейнічаючы ва ўмовах пастаяннай псіхалагічнай напружанасці, падсвядома адхіляецца ад таго, што адбываецца, з дапамогай рамак манітора відэакамеры, тым самым адчуваючы сябе ў адноснай бяспецы. Такі псіхалагічны працэс мы лічым мэтазгодным характарызаваць як феномен "адхіленага погляду".

Дадзены феномен псіхалогіі журналіста практычна не асветлены ў навуковай літаратуры. Ускосна праблема "адхіленага погляду" закранаецца ў працах Алешка В.Ф., Рошчына С.К., Мельніка Г.С. і іншых аўтараў. На нашу думку, найбольшы ўнёсак у гэты кірунак зрабіў Мельнік Г.С., які разглядае псіхалогію "адхіленага погляду" ў працах "Мас-медыя: псіхалагічныя працэсы і эфекты" і "Псіхалогія прафесійных зносін у журналістыцы".

"Адхілены погляд" з'яўляецца своеасаблівай разнавіднасцю прыёму псіхалагічнага адхілення, які выкарыстоўваецца неўсвядомлена ў якасці ахоўнай рэакцыі арганізма на знешнія раздражняльнікі. Гэты працэс можа мець як станоўчыя, так і адмоўныя наступствы для індывіда. У якасці станоўчых

адзначым магчымасць аператара мінімізаваць наступствы ад убачанага (тым самым зніжаецца рызыка псіхалагічных расстройстваў), магчымасць аб’ектыўнай ацэнкі становішча. Адмоўным з’яўляецца скажоная ўпэўненасць у бяспецы, фарміраванне працоўнага цынізму, страта каштоўнасных арыентацый. Ю. Раманаў, расійскі стрынгер, у кнізе “Я здымаю вайну” адзначае: “Калі колькасць загінуўшых у кадрах пачынае пераважваць за крытычную адзнаку, у галаве як быццам пстрыкае пераключальнік, і мозг перастае ўспрымаць пакуты.” (пераклад наш. – *А.К.*) [2]. Адхіленне ад навакольнага становішча ва ўмовах баявых дзеянняў цягне за сабой непапраўныя наступствы. Аператар мае мэтай захаваць пэўныя кадры і не задумваецца пра рызыкі, выконвае спланаванае, рызыкуючы жыццём. Прыклад такіх паводзінаў сустракаем у гісторыі А. Кляна, 68-мі гадовага аператара, на рахунку якога былі камандыроўкі ў Ірак, Афганістан, Чачню. У 2014 г., знаходзячыся на Украіне, ён убачыў сігнальную ракету, пачаў яе здымаць, не заўважыў распачатага абстрэлу і быў смяротна паранены.

Вострая праблема, з якой сутыкаюцца ваенныя рэпарцёры – адсутнасць псіхалагічнай дапамогі пасля знаходжання ў зоне ваенных канфліктаў. Таму ў кантэксце вышэйназваных рызык асаблівае значэнне набывае псіхалагічная падрыхтоўка асоб, якія ажыццяўляюць інфармацыйную дзейнасць у асаблівых умовах. Даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што ў канфлікце відэааператар аказваецца адразу ў трох псіхалагічных пазіцыях: а) сведкі або ўдзельніка канфлікту; б) звяна, якое актыўна ўзаемадзейнічае з пацярпелымі; в) пасярэдніка, які павінен не толькі ўспрыняць інфармацыю, але і перадаць яе аўдыторыі. Узнікае пытанне аб тым, як аператары спраўляюцца са стрэсам і страхам. У кнізе “Груз 200” Андрэя Вароніна гэтаму надаецца асаблівая ўвага: “Гледзячы на тое, што адбываецца праз глазок камеры, можна было адхіліцца ад падзей, перастаць адчуваць сябе іх удзельнікам. Камера давала адчуванне абароненасці, як быццам глядзіш на тое, што адбываецца здалёку, і можаш спыніць ход падзей простым націскам кнопкі. Шчоўк! – і малюнак згас, а куля, якая ляцела прама табе ў галаву, засталася ўнутры пацямнелага, мёртвага экрана, аддзеленая ад цябе пластом тоўстага шкла” (пераклад наш. – *А.К.*) [3]. У сваім творы аўтар распавядае пра аператара, які працуе ва ўмовах ваеннага канфлікту.

Міжнародным правам прадугледжана абарона супрацоўнікаў СМІ. У адпаведнасці з Жэнеўскай канвенцыяй 1949 г., карэспандэнты, што асвятляюць ваенныя канфлікты, носяць знакі адрознення, якія распазнаюцца на вялікіх адлегласцях. У 1995 г. была зацверджана прэмія Роры Пека, названая ў гонар журналіста, які працаваў у Персідскім заліве, Афганістане, Босніі (быў забіты ў 1993 г. у Маскве падчас сутыкненняў у тэлецэнтры “Астанкіна”).

Дадзеная прэмія штогод уручаецца відэаапаратарам-пазаштатнікам, у 2012 г. яе атрымалі аператары з Францыі і Італіі за асвятленне ўзброеных канфліктаў у Лівіі і Сірыі [4].

Такім чынам, сродкам псіхалагічнай абароны відэаапаратараў, якія працуюць у асаблівых умовах, нярэдка выступае псіхалагічны працэс адхілення ад аб’ектыўнай рэальнасці. Феномен “адхіленага погляду”, які характарызуецца як станоўчымі, так і адмоўнымі рысамі, мае патрэбу ў дадатковым вывучэнні, у тым ліку з выкарыстаннем эксперыментальных метадаў. З мэтай мінімізацыі ахвяр сярод супрацоўнікаў СМІ мы лічым неабходным праводзіць трэнінгі ў навучальных установах, якія рыхтуюць кадры для медыя, уводзіць спецыяльныя дысцыпліны, што будуць фарміраваць навыкі процідзеяння прафесійным стрэсавым сітуацыям.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Человеческие жертвы в Иракской войне [Электронны рэсурс] / Свободная энциклопедия “Википедия”. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki Человеческие_жертвы_в_Иракской_войне#cite_note-179. – Дата доступу: 27.04.2015.
2. Журналисты и психологическая травма: первые шаги к решению проблемы [Электронны рэсурс] / A project of columbia journalism school “Dart centr for journalism and trauma”. – Рэжым доступу: http://dartcenter.org/global/журналисты-и-психологическая-травма-первые-шаги-к-решению-проблемы#.VT-I5SHtlBc. – Дата доступу: 27.04.2015.
3. Премию Рори Пека получили видеооператоры из Испании, Италии и Великобритании [Электронны рэсурс] / Информационный портал euronews. – Рэжым доступу: http://ru.euronews.com/2012/11/29/euronews-reporter-wins-award-for-warzone-feature/. – Дата доступу: 27.04.2015.
4. Глядя на происходящее через глазок камеры [Электронны рэсурс] / Электронная библиотека. – Рэжым доступу: http://www.rulit.me/programRead.php?program_id=52330&page=43 – Дата доступу: 27.04.2015.